# ПАДПОЛЬНАЯ ГРУПА
# Г. К. ГРАБЯНЬКОВАЙ

**Перыяд дзеяння:**

канец 1941 г. – люты 1943 г.

**Месца дзеяння:**

Пескавацік, Кастрычніцкі раён г. Віцебска

**Колькасць:**

10 чалавек

**Кіраўнікі:**

Грабянькова Ганна

Дзейнічала ў Віцебску з канца 1941 г. да лютага 1943 г. Аб’ядноўвала 10 чалавек. Кіраўнік групы Г. К. Грабянькова прыцягнула да падпольнай работы сваю маці Ганну Пятроўну, сястру Е. К. Лукашэнка, брата І. К. Лукашэнку, сына Эдуарда, брата мужа К. С. Грабянькова і яго сына Дзяменція. У лютым 1942 г. удзельнікамі групы сталі А. П. і М. І. Шашковы, В. Ц. Вурганава.

Зімой 1941–1942 гг. падпольшчыкі ўстанавілі сувязь з партызанскім атрадам М. Ф. Біруліна (з красавіка 1942 г. у складзе 1-й Беларускай партызанскай брыгады) і выконвалі яго заданні па разведцы, з красавіка 1942 г. група працавала фактычна пад кіраўніцтвам разведгрупы У. А. Мядзведзева («Іспаліна»), у складзе якой ваяваў брат Грабяньковай Аляксандр Гарбатаў. На працягу амаль 5 месяцаў разведчыкі рэгулярна перадавалі ў Цэнтр звесткі пра варожы гарнізон, палітычныя і эканамічныя мерапрыемствы ў горадзе. У кароткі тэрмін з дапамогай сям’і Грабяньковых усе члены групы «Іспалін» былі легалізаваны.

Падпольшчыкі садзейнічалі бесперапыннай рабоце радыёстанцыі. Летам 1942 г. Грабянькова, Вурганава і А. П. Шашкова даставілі сілкаванне для рацыі з-за лініі фронту. У канцы жніўня 1942 г. фашысты схапілі многіх разведчыкаў групы «Іспалін». У лютым

1943 г. былі арыштаваны і пасля катаванняў забіты Г. К. Грабянькова, Д. К. Грабянькоў, К. С. Грабянькоў, Э. Грабянькоў, Е. К. Лукашэнка, І. К. Лукашэнка, А. П. Шашкова. З 10 членаў групы расстралялі васьмярых.

Ніхто не ўзнагароджаны.

**ЛІТАРАТУРА**

1. **Дарафеенка, Н. І.** Падпольная група Г. К. Грабяньковай / Н. І. Дарафеенка // Памяць: Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2002. – Кн. 1. – С. 484.

2. **Подпольная** группа Гребеньковой А. К. // Витебск : энцикл. справочник / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 1988. – С. 286–287.